Эмануіл ЮФЕ

# ЯН СКРЫГАН: «ТВОРЫ — ГЭТА ТАКСАМА БІЯГРАФІЯ»

Аднойчы, калі размова зайшла аб творчасці Яна Скрыгана, народны пісьменнік Беларусі, акадэмік Іван Навуменка заўважыў: «Калі гаварыць шчыра, то без яго творчасці нельга ўявіць сабе беларускую літаратуру ХХ стагоддзя».

Адзін з самых аўтарытэтных айчынных крытыкаў і літаратуразнаўцаў Серафім Андраюк адзначыў, што Янка Скрыган — пісьменнік, народжаны рэвалюцыяй, дакладней, бурнымі дваццатымі гадамі: «Але скрозь, праз усе творы, пра што б ні пісаў аўтар, чуецца любоў і павага да чалавека, вера ў чалавечнасць. Чалавечнасць у Скрыгана — не гучная дэкларацыя, не выпадковая лірычная ўспышка. Яна набытак асабістага жыцця, ім выпакутавана, ім народжана... Пісьменнік меў права не толькі напісаць, сказаць пра добры пачатак чалавечнасці ў чалавеку, а і стварыць жыццёвыя праўдзівыя вобразы шчырых, сумленных, добрых душою, разумных людзей у сваіх творах».

Высокай думкі пра Івана Аляксеевіча быў і Генадзь Шупенька: «Янка Скрыган — пісьменнік вельмі беларускі і сваім духоўным складам, і каларытам, тонам, ладам сваёй прозы. Шчыра зайздросціш веданню, разуменню, адчуванню гэтым энцыклапедычна адукаваным чалавекам самых тонкіх адценняў роднага слова, яго пранікнення ў сам дух мовы».

Сапраўды, ён быў арыгінальным пісьменнікам, талент якога раскрыўся шматгранна: таленавіты празаік, паэт, нарысіст, навеліст, перакладчык, крытык, публіцыст, мемуарыст.

З Янам Скрыганом я пазнаёміўся ў 1957 годзе, будучы студэнтам-першакурснікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Якраз на нашым гістарычным факультэце праходзіла сустрэча з пісьменнікамі, а ў кіёску прадавалі іх кнігі. Я купіў зборнік Скрыгана «Апавяданні», выдадзены годам раней. Атрымліваючы аўтограф, прызнаўся, што мае бацькі да Вялікай Айчыннай вайны жылі і працавалі ў Слуцку, а старэйшы брат там нарадзіўся. Іван Аляксеевіч пажадаў мне праўдзіва расказваць пра трагічную і гераічную гісторыю Беларусі.

Малая радзіма Яна Скрыгана — вёска Труханавічы цяперашняга Капыльскага раёна. Тут у сялянскай сям'і 16 лістапада 1905 года пачаўся яго жыццёвы шлях. У творах «Парогі» і «Свая аповесць» гады маленства ў бацькавай хаце падае аб'ектыўна. З аднаго боку — гэта рай для душы, а з другога — трывожнае пачуццё, бо бацька быў «зачараваны зямлёй». Адсюль яго скупасць і неспагадлівасць. «Я бачыў, як у сясцёр — а яны ж былі маладыя! — парабіўшыся ў крукі, не разгіналіся пальцы. Маладзёж недзе магла хадзіць на кірмашы, збірацца на вячоркі, скакаць, весяліцца, а яны — у гэтым балоце — зналі толькі работу. У людзі ім паказацца не было ў чым. Маці плакала разам з імі...

У школу я пайшоў на сёмым годзе жыцця...

Потым — трывожная тайна літараў Потым першая радасць, калі з літараў склалася слова. Памятаю гэтую хвіліну...

Памятаю нашу настаўніцу Лідзію Сулкоўскую, стройную маладую жанчыну з пакорлівымі і як бы вінаватымі вачамі. Ад яе заўсёды ішла нейкая строгая добрасць, святочная чысціня і далёкая тайнасць».

У 1918 годзе закончыў Труханавіцкую царкоўна-парафіяльную школу. Потым вучыўся ў духоўным вучылішчы ў Слуцку, школах першай і другой ступені, у рэальным вучылішчы, Беларускай гімназіі і сельскагаспадарчым тэхнікуме. Пакінуў яго ў 1924 годзе на чацвёртым курсе.

Працаваў у рэдакцыі слуцкай акруговай газеты «Вясковы будаўнік», якую рэдагаваў Паўлюк Шукайла. З ім у 1925-м паехаў у Расоны. Загадваў Народным домам пры выканкаме. Затым працаваў стыльрэдактарам газеты «Чырвоная Полаччына», а ў 1928 годзе паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пасля заканчэння БДУ Ян Скрыган з 1933 года працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». У 1934 годзе Іван Аляксеевіч уступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яго актыўная літаратурная і грамадская дзейнасць была раптоўна спынена палітычнымі рэпрэсіямі.

13 лістапада 1936 года быў беспадстаўна арыштаваны за «контррэвалюцыйную дзейнасць», асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі і высланы ў Нова-Іванаўскі лагер Кемераўскай вобласці. У 1946 годзе Івана Аляксеевіча вызвалілі з лагера з пазбаўленнем грамадзянскіх правоў на пяцігадовы тэрмін. У 1946—1948 гадах працаваў бухгалтарам на гідролізным заводзе ў Фергане. Каб быць бліжэй да роднай Беларусі, у 1948 годзе пераехаў у Эстонію, дзе ўладкаваўся галоўным бухгалтарам на сланцахімічны камбінат.

25 чэрвеня 1949 года быў арыштаваны другі раз і высланы ў Сухабузімскі раён Краснаярскага краю, дзе працаваў бухгалтарам у райкамгасе і МТС (1950—1951).

9 снежня 1954 года Іван Аляксеевіч напісаў пісьмо першаму сакратару ЦК КПСС Хрушчову. Яно заканчвалася наступнымі радкамі: «Меж тем жалоба моя опять находнтся без двпжения и последствия клеветы н несправедливостн я испытываю на себе на протяженип 18 лет.

Прошу Вашего вмешательства, Вашего указання о пересмотре дела, о новом следствин, о любом мероприятии по рассмотрению моей законной жалобы».

Роўна праз 20 дзён — 29 снежня 1954 года — усе абвінавачванні былі зняты і ён быў поўнасцю рэабілітаваны і адноўлены ва ўсіх правах.

Вярнуўшыся ў Мінск, працаваў рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, літаратурным кансультантам Саюза пісьменнікаў Беларусі, рэдактарам аддзела прозы, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», загадчыкам літаратурна-кантрольнай рэдакцыі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» (галоўны рэдактар Пятрусь Броўка запрасіў як выдатнага знаўца беларускай мовы), адказным сакратаром Камітэта па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва, архітэктуры.

Пісаць пачаў з паэзіі. Упершыню ў друку выступіў пад псеўданімам Пірат з вершам «Вясковая будаўнічая», апублікаваным у чэрвені 1925 года ў слуцкай акруговай газеце «Вясковы будаўнік». Пад гэтым жа псеўданімам у тым годзе там жа былі апублікаваны вершы «Эй, звіні» і «Маладняк». Творы таксама змяшчаліся ў калектыўным зборніку «Слуцкія песняры» (1926), альманаху «Надзвінне» (1926), а потым у альманахах «Росквіт»(1927) і «Зарніцы» (1928).

Карыстаўся псеўданімамі Пірат, Відук, Янка Відук. Пазней паходжанне іх тлумачыў так: «Пірат нясе ў сабе разбуральна-рэвалюцыйную ідэю перамен, знішчэння ўсяго старога, Відук — сімвал неадольнага жыццесцвярджэння, так на Случчыне называюць дзікі мак — самасейку». У вершах таксама прысутнічала «пірацтва». А прыйшоў да яго, пераймаючы іншых.

Як сведчыў вядомы літаратуразнаўца Віктар Каваленка: «Іван Аляксеевіч не быў высокай думкі пра свае першыя паэтычныя спробы, створаныя пад уплывам вельмі прыкметнай фігуры ў літаратурным жыцці 20-х гадоў Паўлюка Шукайлы, якога ён характарызаваў наступным чынам: «Паўлюк Шукайла быў чалавекам агнявой натуры: добрага, шчырага сэрца, партызанскай зухаватасці і бунтарства.

І ў вершах ён прызнаваў толькі бунт і таму адразу пачаў кіраваць нас на футурызм. Мы ў ім не разбіраліся, але Шукайлава энергія передавалася і нам, і мы выпіналіся, як маглі, каб толькі папасці ў той футурызм».

Ян Скрыган ведаў таксама і творчасць беларускіх паэтаў, з якой пазнаёміўся яшчэ ў Слуцку. Ён згадваў: «Я многа чытаў, асабліва пасля таго як на рынку, у будачнікаў, знайшоў кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Змітрака Бядулі. Праз іх я ўбачыў народ куды глыбей, і ў душы варушылася патрэба самому гаварыць. Я пачаў шукаць паэтычнага слова. Нейкі час захапляўся Байранам».

А творчы шлях яго як празаіка пачаўся з апавядання «Таіса» і аповесці «Затока ў бурах». Пераход да прозы быў не просты. Ад некаторых маладнякоўцаў Ян Скрыган адрозніваўся арыентаванасцю на традыцыю, вострым адчуваннем мовы, любасцю да роднага слова, імкненнем вучыцца, а не вучыць.

Апавяданне «Таіса» прынесла яму даволі шырокую вядомасць. Яно пра падзеі часоў Грамадзянскай вайны. Жанравая форма твора — даволі арыгінальная. Гэта зварот-успамін закаханага Петруся да Таісы. Абое яны служаць у пана. Каханне драматычнае, бо сам час быў усеагульнай драмай:

«— Як добра мне з табою, — сказала ты. — Мы больш ніколі, ніколі не будзем сварыцца. І ты больш ніколі не крыўдзь мяне.

І тады я запытаўся:

— А ты заўсёды будзеш са мною? Што б ні здарылася — ты ніколі не пакінеш мяне?

— Ніколі! — адказала ты».

Цікавая канцоўка апавядання. Можна сказаць, што Таіса здрадзіла абяцанню ніколі не пакідаць Петруся і не здрадзіла. Калі скатаванага па загадзе польскага паручніка Гжэцкага паўстанца Петруся пакінулі паміраць, Таіса прыходзіць да яго, прамывае і перавязвае раны, хоча забраць яго з сабою. Пераканаўшыся, што гэта немагчыма, яна пакідае яму маленькі браўнінг. Можна меркаваць, што дзякуючы гэтаму браўнінгу і выжыў Пятрусь, маючы пазней магчымасць згадваць усе перыпетыі іхняга кахання.

Асобае месца ў творчасці Яна Скрыгана займае сацыяльна-бытавая аповесць «Затока ў бурах».

У чым асаблівасці аповесці «Затока ў бурах»?

Па-першае, чырвонай рысай у ёй праведзена лінія гістарычных падзей, сацыяльная лінія. На іх агульным фоне разгорнуты лёс некалькіх персанажаў, вылучаных з агульнай масы.

Па-другое, можа сказаць, што асабліва ўдаліся Яну Скрыгану масавыя сцэны. Яны сапраўды народныя. Нельга забыць трагічных праводзін на Першую сусветную вайну, пыльную дарогу, па якой расцягвалася працэсія, што нагадвае праводзіны ў апошні шлях.

Да таго ж аўтар удала паказаў, як ціхая «затока» — вёска — абудзілася, рушыла грозным і велічным натоўпам у рытме купалаўскага «А хто там ідзе?», які ўзяты эпіграфам да «Затокі ў бурах». Аповесць адкрывала жанравы шлях да твораў болып панарамнага паказу народнага жыцця ў гады гістарычных пераломаў.

Не магу не пагадзіцца з Віктарам Каваленкам: «На гэтым шляху адначасова ці пазней з'явіцца раман К. Чорнага «асабістага лёсу і лініі персанажаў «Зямля» (1928) і раман М. Лынькова «На чырвоных лядах» (1934) з больш суровай вытрымкай рэалістычнага прынцыпу, бо эпілог аповесці «Затока ў бурах» адкрыта меладраматычны».

Пасля ссылкі за кароткі тэрмін Ян Скрыган апублікаваў шэраг празаічных зборнікаў, цэнтральнай тэмай якіх было захаванне і ўзбагачэнне духоўных рэсурсаў чалавека — «Апавяданні» (1956), «Наталя» (1957), «Няпрошаная сляза» (1958), «Скажы адно слова». У 1964 годзе да ягонага 60-годдзя выйшла кніга «Свая аповесць», у аснове якой — памяць, што з'ўлялася галоўным

сувязным звяном гісторыі, таму зборнік расказваў пра аўтара, яго творчасць і пра сучаснікаў.

Спалучыўшы ўласны жыццёвы вопыт з дарогамі, якімі прайшлі яго героі, Ян Скрыган у 1960-я гады стварае аўтабіяграфічную кнігу з характэрнай назвай «Кругі». Яна стала галоўнай у творчасці Івана Аляксеевіча. Дарэчы, у бібліяграфічнай даведцы серыі «Бібліятэка беларускай прозы» сам Ян Скрыган лічыў яе завяршэннем многіх сваіх задумак. Эпіграфам да яе ўзяў словы Максіма Танка: «Біяграфія ў песні маёй і ў мяне — адна».

Ацэньваючы «Кругі» Серафім Андраюк падкрэсліў: "Кругі" — не зборнік, а менавіта галоўная кніга пісьменніка. Усе творы маюць адзін пафас, адну ідэю — ідэю еднасці мастака, еднасці ўвогуле чалавека з лёсам народа, з лёсам краіны. Ідэя арганізуе ўвесь матэрыял, арганізуе размяшчэнне твораў у кнізе. А яно, гэтае размяшчэнне, своеасаблівае. Звычайна ў такіх кнігах усе творы размяркоўваюцца ў храналагічнай паслядоўнасці паводле часу напісання. У Я. Скрыгана свая храналогія. Храналогія не так творчасці пісьменніка, як яго жыцця, жыцця краіны…

Аўтабіяграфічнасць надае кнізе жыццёвую верагоднасць і пераканаўчасць, шчырасць і даверлівасць…

Пісьменнік, калі мець на ўвазе кнігу цалкам, не абмежаваўся дакладным узнаўленнем духоўнай атмасферы часу, уласцівай творам тых гадоў. Ён пайшоў далей. У пэўнай ступені паспрабаваў на падзеі мінулага паглядзець з вышыні сучаснасці, уключыць іх у агульны гістарычны ланцуг, выверыць тым самым мінулае сучаснасцю, а сучаснасць мінулым…»

Гэтая кніга складаецца з чатырох вялікіх частак, названых кругамі: круг першы — «Парог», круг другі — «Світанак», круг трэці — «Трывогі» і круг чацвёрты — «Сугучча». Такі падзел быццам звязаны з пэўнымі этапамі жыцця пісьменніка. Але толькі вонкава. Вельмі важна, што за ім знаходзіцца лёс самога Івана Аляксеевіча, жыццё краіны і беларускага народа. Таму не дзіўна, што ў адным крузе ёсць творы, напісаныя ў розныя гады, у розны час. Каштоўнасць твора «Кругі» у тым, што яднае іх не толькі аўтарская агульнасць, выражаная жыццёвай аўтабіяграфічнасцю, але і эмацыянальная настраёвасць і ідэйная накіраванасць.

Ян Скрыган — адзін з пачынальнікаў, першапраходцаў беларускага нарыса як новага літаратурнага жанру. Многія крытыкі лічаць, што гэтая малая форма стала ўзорам яго надзвычайна багатай і глыбока нацыянальнай творчасці. Аб гэтым сведчаць яго твор «Новая зямля» (1929), зборнікі «Шугае сонца» (1930), «Недапісаны профіль» (1932).

У нарысах Яна Скрыгана праўдзіва перададзена працоўная атмасфера 1930-х гадоў. Тады на першым месцы грамадскіх клопатаў была праца, а не чалавек. Чалавек — нібы прыдатак да вытворчасці, плана.

Па-мойму, адна з самых цікавых і каштоўных кніг Івана Аляксеевіча «Некалькі хвілін чужога жыцця» (1979). Расказваецца пра сустрэчу з Кузьмой Чорным, што яшчэ раз пераканала, якога вялікага маштабу талент гэтага тады яшчэ маладога пісьменніка. Шмат цікавага можна даведацца і аб першай сустрэчы з Якубам Коласам. Грунтоўнымі і ўсхваляванымі атрымаліся ўспаміны пра Міхася Лынькова («Нарачанскі чараўнік») і Івана Мележа («Мой сусед Іван Мележ»). Навідавоку чуласць, дабрата, спагадлівасць і рыцарская сумленнасць Міхася Лынькова, схільнасць Івана Мележа правяраць напісанае на сябрах і знаёмых, яго палахлівае нявер'е ў сябе, звычка не паслядоўна весці плынь зместу твора, а спачатку вылучаць эпізоды, якія ў дадзены момант сюжэтна склаліся найбольш выразна.

Ян Скрыган стварыў літаратурныя партрэты Міхася Зарэцкага, Цішкі Гартнага, Платона Галавача, Сымона Баранавых, Кандрата Крапівы, Петруся Броўкі і іншых пісьменнікаў.

Нагадаю радкі з уступу Алеся Жука «Роднасць лёсу і песні» да двухтомніка Яна Скрыгана «Выбраныя творы» (1985): «І яшчэ ёсць у пісьменніка адзін паста-

янны клопат — родная мова. Ён умее напісаць пра яе з глыбокай зацікаўленасцю, з веданнем і шанаваннем, з гаспадарскай заклапочанасцю. Моўная культура бачыцца ім як неабходная перадумова развіцця культуры наогул, як першааснова пісьменніцкага майстэрства…»

Сам Ян Скрыган быў упэўнены: «Ведаць мову — значыць, ведаць законы яе будавання, ведаць яе народную аснову. Бо толькі ведаючы народную аснову мовы, можна ведаць, як проста і правільна выказваць думку, як натуральна, паводле законаў гэтай мовы, пабудаваць фразу, дзе якое сказаць слова, патрэбнае іменна для гэтага месца, дзе зрабіць націск, дзе і як вымавіць галосныя, зычныя, цвёрдыя, мяккія, уласцівыя гучанню гэтай мовы. Ведаць мову — гэта ў першую чаргу ведаць, як гаворыць народ, бо яна — сродак зносін людзей».

Іван Аляксеевіч быў і таленавітым перакладчыкам. У сваю чаргу многія яго творы перакладзены на рускую, азербайджанскую, англійскую, армянскую, балгарскую, латышскую, малдаўскую, мангольскую, нямецкую, польскую, славацкую, таджыкскую і ўкраінскую мовы.

У 1976 годзе Ян Скрыган стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі за ўдзел у стварэнні «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі» ў 12 тамах. У 1985 годзе яму было прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларусі.

Адна з самых таленавітых беларускіх пісьменніц Алена Васілевіч падкрэсліла: «Я перачытваю кнігі Яна Скрыгана — старонку за старонкай — і мне не хочацца развітвацца з імі. Я чую жывую інтанацыю пісьменніка, бачу яго ўсмешку, яго насупленае брыво. Мяне спыняе яго роздум. З асалодаю, як бярозавік у летнюю гарачыню, у смак п'ю мову Скрыганавых старонак. Я вучуся ў яго. Ён цікавы і патрэбны мне. Бо ён не толькі пісьменнік. Ён — асоба. І гэта — такое *даткненне*, як піша сам Скрыган, — у літаратурным жыцці свята».

Не сумняваюся, што з гэтым згодзяцца ўсе, хто добра ведае творчасць Івана Аляксеевіча. Ён пайшоў у вечнасць 18 верасня 1992 года. І назаўсёды застаўся ў беларускай літаратуры.